## ФАРМІРАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПА ВЫВУЧЭННІ ТВОРЧАСЦІ В. БЫКАВА

***Кудзін М.А.*** *(УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *В.П. Шаўчэнка, ст. выкладчык*

У апошнія гады значна ўзрасла цікавасць грамадскасці да творчай спадчыны В. Быкава. “Аўтарытэт пісьменніка пацверджаны ўсім яго ранейшым жыццём, яго мужнасцю ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён не міфічны волат, не рыцар у жалезных рыштунках, а чалавек, які сваімі праўдзівымі творамі змагаўся супраць вайны як найвялікшага зла” [1, с. 94]. Ён умела і бескампрамісна адкрывае праўду нашай гісторыі, таму сённяшнія школьнікі не павінны пазбаўляцца высакароднага пачуцця гістарычнай памяці. Каб не было гэтага прагалу ў іх выхаванні, неабходна, на нашу думку, вывучаць творы Васіля Быкава, якія спрыяюць выхаванню патрыятычных пачуццяў, высокіх маральных якасцяў, фарміруюць гістарычную памяць.

У сёмым класе вучні пачынаюць знаёміцца з творчасцю В. Быкава, дзе асноўная ўвага ўдзяляецца яго ранім творам: апавяданням, аповесцям. Даўно сталі праграмнымі такія творы, як “Незагойная рана”, “Жураўліны крык”, “На ўсходзе сонца”, “Дажыць да світання”, “Сотнікаў”, “Знак бяды”. Вучням бывае цяжка зразумець усю шырыню адлюстравання гістарычнай эпохі, пагэтаму асаблівую ўвагу пры вывучэнні твораў В. Быкава патрэбна ўдзяліць разгляду гістарычнай асновы, часу, што ахоплівае твор, месцу, дзе адбываюцца падзеі. І, каб работа на ўроку была больш плённай, настаўнік павінен прапанаваць вучням блок канцэптуальных, праблемных пытанняў. Падрыхтоўка адказаў на такія пытанні абавязкова запатрабуе ад іх самастойнага роздуму над такімі адвечнымі катэгорыямі, як чалавечая і гістарычная памяць, радзіма, народ, мова, матэрыяльная і духоўная культура, праблема маральнага выбару, перад якімі заўсёды стаяць героі В. Быкава.

Такім чынам, на прыкладзе твораў В. Быкава вучні павінны зразумець, што без гістарычнай памяці няма духоўнасці і няма маральнасці, паколькі маральная норма – гэта тое, што перажыта і выпакутавана народам, што замацавана ў яго менталітэце і перадаецца праз пакаленні. Мінулае павінна служыць урокам. І творы В. Быкава – цудоўны ўзор фарміравання гістарычнай памяці школьнікаў.

**Літаратура**

1. Афанасьеў, І. Будзем садзіць сад… : Літаратурна-крытычныя артыкулы / І. Афанасьеў. – Мінск : Бібліятэка часопіса “Маладосць”. – 1994. – С. 92–101.

МГПУ им. И.П.Шамякина